# Уручэнне Прэміі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму ў сферы культуры і мастацтва 2017 года

**На падставе рашэння Прэзідыума Цэнтральнага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму ад 3 кастрычніка 2017 года Лаўрэатамі Прэміі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму ў сферы культуры і мастацтва 2017 года сталі:**

у намінацыі "Літаратура, журналістыка, крытыка":

— Бузук Расціслаў Леанідавіч, доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры тэатральнай творчасці УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (г. Мінск);

у намінацыі "Музычнае мастацтва":

— Дзяменцьева Наталля Віктараўна, артыст-вакаліст, вядучы майстар сцэны ўстановы "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь "Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр" (г. Мінск);

у намінацыі "Жывапіс, скульптура, графіка, дызайн і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва":

— Сапоцька Павел Міхайлавіч, дырэктар мастацкай галерэі "Універсітэт культуры", выкладчык кафедры міжкультурных камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", старшыня Праўлення Мінскага абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры (г. Мінск);

у намінацыі "Тэатральнае мастацтва":

— калектыў дзяржаўнай установы "Палескі драматычны тэатр г. Пінск" (дырэктар Лукашэнка Аляксандр Мікалаевіч) (Брэсцкая вобласць);

— Панджавідзэ Міхаіл Аляксандравіч, галоўны рэжысёр дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы "Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь";

у намінацыі "Народная творчасць":

— народны хор работнікаў культуры "Зараніца" ДУ "Лельчыцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лельчыцкага райвыканкама Гомельскай вобласці (кіраўнік Ляўкоўскі Уладзімір Мікалаевіч) (Гомельская вобласць);

у намінацыі "Аматарская мастацкая творчасць":

— народны тэатр "Рэха" ўстановы "Рэспубліканскі Палац культуры прафсаюзаў" (мастацкі кіраўнік Жураўскі Андрэй Валер'евіч) (г. Мінск);

— Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца "Лялечкі" Абухаўскага цэнтра культуры філіяла дзяржаўнай установы культуры "Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр" (кіраўнік — Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Урукіна Надзея Іванаўна) (Гродзенская вобласць);

у намінацыі "Цыркавое мастацтва":

— творчы дуэт ДВУ "Беларускі дзяржаўны цырк" Быхан Вячаслаў Уладзіміравіч і Нус Крысціна Уладзіміраўна (г. Мінск).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ